4. Гродненские губернские ведомости. Отдел второй. Часть неофициальная. – 1854. – 29 сент. – С. 2.
5. Гродненские губернские ведомости. Часть неофициальная. – 1864. – 17 янв. – С. 2-3.
6. Гродненские губернские ведомости. Часть неофициальная. – 1864. – 14 авг. – С. 2.
7. Гродненские губернские ведомости. Часть неофициальная. – 1864. – 11 дек. – С. 2.
8. Концерт г-жи Роджерс // Гродненские губернские ведомости. – 1867. – 14 июля. – С. 144.
9. Хроника // Гродненские губернские ведомости. Неофициальная часть. – 1891. – 23 марта. – С. 1.
10. Хроника // Гродненские губернские ведомости. Неофициальная часть. – 1891. – 2 окт. – С. 1.
11. Хроника // Гродненские губернские ведомости. Неофициальная часть. – 1892. – 29 фев. – С. 1.
12. Хроника // Гродненские губернские ведомости. Неофициальная часть. – 1893. – 7 апр. – С. 1.
13. Хроника // Гродненские губернские ведомости. Неофициальная часть. – 1894. – 5 марта. – С. 1.
14. Хроника // Гродненские губернские ведомости. Неофициальная часть. – 1894. – 12 марта. – С. 1.
15. Театр // Гродненские губернские ведомости. Неофициальная часть. – 1896. – 3 июля. – С. 1.

УДК 572.028

# ФАКТАРЫ ФАРМАВАННЯ ЭТНІЧНЫХ СТЭРЭАТЫПАЎ У БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТ

**Э.А. Мазько**
УА “Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

В статье раскрыты основные факторы формирования этнических стереотипов в Беларуси в начале XX века – социальный, конфессиональный и этнический. Сделан анализ их влияния на возможность межкультурной коммуникации.

In article major factors of formation of ethnic stereotypes in Belarus in the XX-th century beginning – social, religious and ethnic are opened. The analysis of their influence on possibility of intercultural communications is made.

Адным з асноўных складнікаў міжкультурнай камунікацыі ў поліэтнічным грамадстве з’яўляюцца этнічныя стэрэатыпы. Менавіта яны вельмі часта выступаюць тым фактарам, які дапускае само існаванне такой кумунікацыі ці, прынамсі, апасродуе яе. Таму вельмі важна ведаць не толькі змест этнічных стэрэатыпаў, якія бытуюць у грамадстве, але і ведаць гісторыю іх з’яўлення, тыя чыннікі, якія найбольш паўплывалі на іх фармаванне і спосабы бытавання.

Фармаванне, змест і бытаванне этнічных стэрэатыпаў пачатку XX ст. у многім залежыла ад тагачаснай грамадска-палітычнай і сацыя-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

культурнай сітуацыі ў краі. У гэты час Беларусь з’яўлялася часткай Расійскай імперыі. Найперш адзначым, што тэрыторыя краю не складала ў ёй нейкай адасобленай адміністрацыйнай адзінкі, але была падзелена на пяць губерняў – Віленскую, Гродзенскую, Мінскую, Магілёўскую і Віцебскую. Акрамя таго, беларусы пражывалі на тэрыторыі некаторых паветаў Смаленскай, Ковенскай, Сувалкаўскай і Чарнігаўскай губерняў. Усяго на азначаных тэрыторыях у канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў пражывала 5 710 тыс. беларусаў (з іх 5 408 тыс. – у пяці заходніх губернях, тэрыторы якіх ахоплівае геаграфічныя межы нашага даследавання). Акрамя іх на тэрыторыі гэтых губерняў кампактна пражывала таксама 3,1 млн. рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў [4, 332].

Уся гэтая нацыянальная пярэстасць стварала даволі складаную этна-культурную сітуацыю. Для яе аналізу скарыстаемся схемай, прапанаванай расійскім даследчыкам А.С. Мыльнікавым, які вылучаў наступныя ўклады ў культурах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы: культура дадзенага этнасу (A), культура генетычна блізкага этнасу (B), культура іншаэтнічная, але тыпалагічна блізкая (C), культура для дадзеных культур знешняя, альбо культурны фон (D) [3, 40]. Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі бытавала беларуская культура як культура асноўнага этнасу (уклад A), роднасныя ёй польская, руская і ўкраінская культуры (B), тыпалагічна блізкая літоўская культура (C), яўрэйская культура (D).

Разам з гэтай этнічна-прасторавай (гарызантальнай) распаўсюджанасцю, гетэрагеннасць этна-культурнай сітуацыі ў краі мела і іерархічны (вертыкальны) характар, які адпавядаў сацыяльным структурам беларускага грамадства. Абсалютная большасць беларусаў, якія складалі прыблізна 65 % насельніцтва, жыла ў сельскай мясцовасці і адносілася да сялянства. Агулам сяляне сладалі 92,16 % ад агульнай колькасці этнасу [2, 30]. Сярод мяшчан налічвалася 14,5 % беларусаў [4, 333]. У агульным ліку спадкаемнай шляхты доля беларусаў складала 1,57 %[2, 30] (2,5 % [4, 333] агульнай колькасці этнасу). “Свабоднымі прафесіямі” (лекары, настаўнікі, адвакаты, дзеячы мастацтваў і навукоўцы) займалася ўсяго 0,47 % беларусаў [2, 31].

Зусім іначай сітуацыя выглядала з прадстаўнікамі другіх этнасаў. Так ад агульнай колькасці палякаў, якія складалі 9,1 % насельніцтва, 24-29 % з’яўляліся прадстаўнікамі патомнай шляхты. Аб сацыяльным складзе рускага насельніцтва сведчыць наступная статыстыка: сярод сялян яны складалі 5 %, сярод патомнай шляхты – 16 %, асабістых дваран (чыноўнікі) – 51,8 %, святарства – 61,5 %.

Пераважная большасць яўрэяў (13,8 % усяго насельніцтва) пражывала ў гарадах і мястэчках – 53,5 % [4, 333].

Вышэйакрэсленная сітуацыя прыводзіла да таго, што ў поліэтнічным беларускім грамадстве культура этнасаў выконвала нераўназначныя функцыі. Так, польскасць (у асяроддзі рыма-каталікоў) і рускасць (у асяроддзі праваслаўнага насельніцтва) выконвалі на гэтай тэрыторыі функцыі ардадамінантнай субкультуры [1,13]. Беларускасць - звязвалася з сацыяльнымі нізамі, функцыянавала як сялянска-плебейская субкультура. Да ліку сялянска-плебейскіх субкультур адносіліся таксама ўкраінская і літоўская. Яўрэйская культура традыцыйна звязвалася з мяшчанска-буржуазным станам.

Гетэрагеннасць этна-культурнай сітуацыі пачатку XX ст. ў Беларусі значна ўскладніла структуру існуючых у грамадстве стэрэатыпаў. Найперш, іх змест і бытаванне выразна залежылі ад сацыяльнага статусу адзінкі. І тое, што ўкладалася той ці іншай асобай у паняцці “паляк”, “рускі”, “беларус”, у значнай ступені вызначалася яе прыналежнасцю да пэўнай сацыяльнай групы. Можна сцвярджаць, што этнічныя стэрэатыпы ў асяроддзі сялян, мяшчан, шляхты і інтэлігенцыі былі розныя.

Не ў меншай ступені ўплывала на азначэнне гэтых паняццяў і рэлігійнае веравызнанне. Было б бязглуздзіцай сцвярджаць, што польская інтэлігенцыя у якасці дамінантнага фактара сваёй нацыянальнай тоеснасці прымала канфесійны характар. Безумоўна, тут большую ролю адыгрывала культура, мова, паходжанне, а таксама сфармаваны вобраз Польшчы як “ідэальнай радзімы”. Яшчэ меншае значэнне канфесійны фактар меў для беларускай інтэлігенцыі, якая ў якасці падваліны беларускай ідэнтычнасці разумела родную мову. Зусім іначай сітуацыя выглядала ў выпадку з сялянствам і мяшчанамі-хрысціянамі мясцовага паходжання. Сярод гэтых сацыяльных груп у пачатку XX ст. плённа дзейнічалі наступныя схемы вызначэння ўласнай тоеснасці:

| | |
|---|---|
| каталіцтва = польская вера | праваслаўе = руская вера |
| каталік = паляк | праваслаўны = рускі |

Аднак, што ўкладвалася ў гэтыя азначэнні? Бясспрэчна, што для пэўнай часткі мяшчан, асабліва ў пэўнай ступені адукаваных, тут меўся нацыянальны аспект. Але ў выпадку сялян маем справу з канфесійнай тоеснасцю. Увогуле, на нашу думку, нацыянальная тоеснасць для пераважнай большасці сялян у пачатку мінулага стагоддзя не была актуальнай. І калі нехта з іх называў сябе “палякам” альбо “рускім”, дык акрэсліваў гэтым не нацыянальную, але рэлігійную сваю прыналежнасць. Безумоўна, на беларуска-польскім і беларуска-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

літоўска-польскім памежжы мела месца паланізацыя (самапаланізацыя) – перайманне часткай беларускіх (ці літоўскіх) сялян польскіх моўна-этнічных уласцівасцей. Аднак што выступала іх галоўным фактарам? На наш погляд, не зусім дакладным з’яўляецца сцверджанне, што “асноўнымі фактарамі паланізацыі і самапаланізацыі было атаясамліванне каталіцызма з польскасцю і тое, што польскасць у вачах сялян сімвалізавала больш высокае сацыяльнае становішча і больш высокі ўзровень культуры” [5, 118]. Калі першы фактар не выклікае пярэчанняў, дык справа з “высокім узроўнем культуры” ў дачыненні да сялян не зусім правамоцна. Безумоўна, польскасць успрымалася як высокая культура прывіліяваных варстваў. Аднак далучэнне да яе з боку сялян не азначала аўтаматычнага падвышэння іх сацыяльнага статусу. Ці, кажучы іншымі словамі, калі беларус-каталік пачынаў гаварыць па-польску, дык ад гэтага ён не станавіўся ні шляхціцам, ні панам. Зрэшты, ён і настаўнікам стаць не мог, бо гэтую магчымасць выключала адмысловая нацыянальная палітыка царскага ўраду ў дачыненні да каталікоў. Даволі туманным было і ўяўленне беларускіх сялян-каталікоў аб польскай культуры.

Важным з’яўлялася і этнічная прыналежнасць, а таксама ўзровень нацыянальнай свядомасці. У вышэй названых абставінах узровень гэты быў нязначны. Больш важным крытэрыем самаакрэслення насельніцтва Беларусі была рэгіянальная прыналежнасць. Традыцыйна вызначэне сялянамі сваёй тоеснасці адбывалася праз прывязанасць да роднай зямлі, краявіду, звычаяў і адрозненняў ад суседзяў [7, 602]. Нават на беларуска-польскім этнічным памежжы, дзе сутыкаліся дзве розныя моўна-этнічныя стыхіі – беларускасць і польскасць – лакальная самасвядомасць дамінавала.

Усе гэтыя тры чыннікі – сацыяльны, канфесійны і этнічны – не былі адасоблены адзін ад другога. Так, напрыклад, этнічныя стэрэатыпы, якія бытавалі ў асяроддзі беларускага сялянства, ва ўмногім вызначаліся сацыяльным статусам (селянін), веравызнаннем (праваслаўны ці каталік), узроўнем нацыянальнай свядомасці (“тутэйшы” альбо “свядомы беларус”).

Неабходна сцвердзіць, што да пачатку ХХ ст. этнічныя стэрэатыпы хаця і прысутнічалі ў свядомасці насельніцтва, але не адыгрывалі якой-кольвечы важнай ролі. Вынікала гэта як з даволі слабой нацыянальнай свядомасці пераважнай большасці сялянскага насельніцтва, так і з неактуальнасці такой тоеснасці. Зразумела, сяляне выразна адрознівалі сябе ад неславянскіх этнасаў (яўрэі, цыгане, літоўцы). Зусім інакш справа выглядала з блізкімі славянскімі этнасамі. Можна сцвердзіць пэўную ўмоўнасць падзелу сялянства на беларусаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

палякаў, рускіх, украінцаў (маларосаў). Што да апошніх, дык іх наяўнасць у выніках перапісу 1897 г. – хутчэйвынік абазнанасці перапішчыкаў у блізкасці мясцовых гаворак да ўкраінскай мовы, чым у веданні палешукоў пра існаванне такой мовы, ужо не кажучы пра наяўнасць у іх якой-кольвечы украінскай нацыянальнай свядомасці. Зрэшты ў пачатку XX ст. пераважная большасць беларусаў таксама не ведала пра беларускую мову і беларускі этнас.

У XIX ст. ў грамадска-палітычным і сацыяльна-культурным жыцці Беларусі дамінавалі дзве сілы – польскі нацыянальна-вызваленчы рух і расійскі царызм, якія змагаліся між сабою за панаванне ў краі. У пачатку XX ст., у выніку адраджэнскіх працэсаў, з’яўляецца беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, які паступова пачынае адыгрываць усё большую ролю ў жыцці краіны. Рух гэты быў успрыняты неадназначна. Калі ў пачатку яго існавання частка польскіх дзеячаў вітала беларусаў і аказвала ім пэўную дапамогу, дык з цягам часу большасць яе перайшла на выразныя антыбеларускія пазіцыі. Што датычыцца царскай адміністрацыі, дык яе стаўленне да беларускага руху ад самага пачатку было варожае. Існаванне трох вышэйакрэсленых палітычных сіл, іх барацьба паміж сабой паўплывалі і на характар этнічных стэрэатыпаў. Пэўную ролю ў фармаванні і бытаванні этнічных стэрэатыпаў адыгрываў і “заходне-русізм”, які ў пачатку мінулага стагоддзя “пачынае ўваходзіць у сістэму ваяўнічага расійскага нацыяналізму як адна з яго складовых частак, ён абяртаецца ў адзін з аванпостаў наступлення Расіі на захад” [6, 306].

Літаратура


1. Куль-Сяльверстава С.Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIIIст. – 1820-я гады).- Мінск: БДУ, 2000.- 260с.
2. Ліндэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX-XX ст. / Пер. з ням. Л. Баршчэўскага; нав. рэд. Г. Сагановіча. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – 540 с.
3. Мыльников А.С. Роль культуры в становлении национального самосознания народов Центральной и Юго-Восточной Европы // Формирование национальных культур в странах Центральной и Юго-Восточной Европы .- М.: Наука, 1977.- С.37-50.
4. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. Ч. 1. – Мн.: Беларусь, 1994. – 527 с.
5. Смалянчук А. Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905-1907 гг. – Гародня: Ратуша, 2000. – 204 с.
6. Цвікевіч А. “Западно-руссизм”: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / Пасляслоўе А. Ліса. 2-е выд. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
7. Smułkowa E. Wokół problemu poczucia tożsamości mieszkańców Białorusi// Przegląd Wschodni.- 1997.- T.IV, z.3(15).- s.597-609.